

*Дзіяна Кірута «Джон Ленан».*

# Конкурс... фіялетавы

**Днямі ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў VIII Рэспубліканскай выстаўкі сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі «АРТ-АКАДЭМІЯ».**

Экспазіцыя ладзіцца ў нашай краіне восьмы раз, і ўжо была зялёнай, сіняй, жоўтай, блакітнай, чырвонай, белай, аранжавай... Сёлета атрымала назву «Фіялетавы. Спакуса незвычайнасцю».

Зала ўстановы літаральна перафарбавалася ў фіялетавы колер, і таму атмасфера панавала містычная і таямнічая. Экспазіцыю склалі творы прафесіяналаў і аматараў, выкананыя ў розных тэхніках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Былі прадстаўлены жывапіс, акварэль, габелен, бісерапляценне, вышыўка, фатаграфія і г. д.

Выстаўка аб'яднала юных творцаў з усіх рэгіёнаў краіны. У конкурсе ўзялі ўдзел індывідуальныя аўтары і творчыя студэнцкія калектывы, студыі дызайну, фота, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, тэатры моды ўстаноў вышэйшай адукацыі. Экспертная група вызначыла пераможцаў у намінацыях, адзначыла лепшыя работы дыпломамі і прызамі.

«Праект — выдатная магчымасць праявіць сябе, раскрыць уласныя таленты», — зазначыла Наталля Пшанічная, начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Арганізатары сёлетняй выстаўкі — Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры краіны, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

**Ганна ПАЛЯКОВА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ